**Мурашка, Г. Г.** Наша памяць – Афганістан / Г. Г. Мурашка ; гутарыў В. Бірукоў // Наша Талачыншчына. — 2002. — 16 лют. — С. 2.

## НАША ПАМЯЦЬ – АФГАНІСТАН

*Георгій Георгіевіч Мурашка з'яўляецца старшынёй раённага савета воінаў-інтэрнацыяналістаў. У Афганістан трапіў пасля «вучэбкі» ў Туркменістане, у чэрвені 1981 года. Служыў у Кабуле, у мотастралковым палку. З'яўляўся вадзіцелем аўтамабіля «Урал-375». Удзельнічаў у баях, у ахове такіх важных падчас ваенных дзеянняў аб'ектаў, як дарогі. Яны і сёння ў памяці – трывожныя і небяспечныя на кожным сваім кіламетры дарогі вайны ў Афганістане Кабул – Баграм, Кабул – Джалалабад, дарогі цераз знакамітую Паншэрскую цясніну. 15 лютага споўнілася 13 гадоў, як у гэты дзень у 1989 годзе савецкія войскі былі выведзеныя з Афганістана. На палях афганскай вайны загінула больш за 870 беларускіх хлопцаў, у іх ліку* 5 *ураджэнцаў Талачыншчыны.*

**– Георгій Георгіевіч, а што з перажытага жыве ў памяці і сёння?**

– Роўна 2 гады я правёў у Афганістане і больш трох месяцаў у Туркменіі. У апошняй праходзіў курс маладога байца. Усё разам узятае не магло не пакінуць аб сабе ўспамін і тады, калі, здаецца, можна было супакоіцца, на нешта забыцца. Але ці забудзешся на смерці тых, хто быў тваім сябрам, з кім пераносіў і спякоту, і холад, і голад, выпрабаванні, якія ў мірны час табе і не сніліся. Ваня Кізімаў з Краснадара падарваўся на міне, а мы разам з ім прыйшлі ў Кабул, старшы лейтэнант Саша Сергіенка, які вёў калону БТРаў, быў адрэзаны душманамі ад калоны, яго машына была запаленая, да апошняй кулі адстрэльваўся. Разумеў, што яго акружаюць, адчуў пагрозу палону, але не здаўся. Паспеў сабе зрабіць перавязку рукі, потым ворагі заўважылі, што набліжаецца падмога, і паласнулі па Аляксандру з аўтамата. Усё цела яго было зрашэчанае кулямі...

**– А чым сёння жывуць воіны-афганцы раёна, як часта сустракаецеся разам?**

– Сустракаемся не так часта, як хацелася б. Многім з нас ужо за сорак, зразумела, усе здольныя прымаць самастойна адказныя рашэнні. Спадзявацца мы прывыклі толькі на сябе. Ніхто не б'е ў грудзі, што «там» былі, што, маўляў, героі. Не крыўдзімся, што ў свядомасці нашага грамадства тэма Афганістана паступова саступае месца іншым тэмам і праблемам. Але ў сэрцы і душы братэрства воінаў-інтэрнацыяналістаў жыве і будзе жыць. Трымаем сувязь адзін з адным, сябруем, наведваем сем'і загінуўшых, 23 лютага ўскладаем кветкі на магілы тых, хто аддаў жыццё, выконваючы свой абавязак. Мне тэлефануюць хлопцы, многія прыходзяць. Рашэнне, калі яно патрабуецца, знаходзім усім узнікаючым пытанням і праблемам разам. Успамінаем сваіх, той час. Зараз з прыходам у Афганістан амерыканцаў на тэлебачанні паказваюць тыя, да болю і слёз знаёмыя, мясціны. Перазваньваемся, у нашым калектыве, у ААБ «Беларусбанк», працуюць таксама былыя воіны-афганцы, абменьваемся з імі ўражаннямі, меркаваннямі. Аб тым, што выконвалі свой патрыятычны і інтэрнацыянальны абавязак, большасць з нас не шкадуе. Канешне, не ўсе вярнуліся, некаторыя маюць раненні, і на гэта немагчыма забыцца.

Хачу ўсім пажадаць вытрымкі, аптымізму і зберагчы ў душы тое, чым можна ганарыцца і даражыць. А даражым мы вельмі многім. Зразумець гэта можа толькі той, хто прайшоў у сваім жыцці Афганістан, каму сёння стукае ў сэрца боль і трагедыя афганскай вайны.

**Гутарку вёў В. Бірукоў**